Ба 35502
52.61.943
2

ДЗЯРЖАЎНАЯ БІБЛІЯТЭКА БССР імені В. І. ЛЕНІНА
НАВУКОВА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫ АДДЗЕЛ

*У дапамогу работнікам сельскай гаспадаркі*
*Вып. 11*

# КНІГІ АБ ПЕРАДАВЫМ ВОПЫЦЕ Ў СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ БССР

**Рэкамендацыйны спіс літаратуры**

Ба 35502
Бел. аддзел 1954

Мінск—1952

У пятым пяцігадовым плане ў галіне сельскай гаспадаркі галоўнай задачай і надалей застаецца павышэнне ўраджайнасці ўсіх сельскагаспадарчых культур, далейшае павелічэнне грамадскага пагалоўя жывёлы пры адначасовым значным росце яе прадуктыўнасці, павелічэнне валавой і таварнай прадукцыі земляробства і жывёлагадоўлі шляхам далейшага ўмацавання і развіцця грамадскай гаспадаркі калгасаў, палепшання работы соўгасаў і МТС на аснове ўкаранення перадавой тэхнікі і агракультуры ў сельскай гаспадарцы.

Дзякуючы велізарнай дапамозе партыі і ўрада, нястомным бацькаўскім клопатам таварыша Сталіна аб беларускім народзе і самаадданай працы калгаснікаў, работнікаў МТС і соўгасаў, калгасы рэспублікі няўхільна развіваюць вытворчасць і памнажаюць сваё грамадскае багацце, абапіраючыся на ўсебаковую дапамогу і падтрымку партыі і дзяржавы.

Партыя і Урад заўсёды ўказвалі, што ўкараненне ў калгасную вытворчасць дасягненняў навукі і перадавога вопыту з'яўляюцца неад'емнай часткай кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, адной з галоўных умоў павышэння культуры земляробства, няўхільнага ўздыму і развіцця ўсіх галін грамадскай гаспадаркі калгасаў.

Савецкае сялянства актыўна змагаецца за вырашэнне галоўнай задачы ў галіне сельскай гаспадаркі — далейшы ўздым ураджайнасці ўсіх сельскагаспадарчых культур, павелічэнне грамадскага пагалоўя жывёлы, пры адначасовым значным росце яе прадуктыўнасці. Выкананне гэтай задачы ў значнай меры залежыць ад таго, наколькі шырока будзе ў калгасах пастаўлена ўкараненне ў сельскай гаспадарцы дасягненняў навукі і вопыту перадавікоў.

Перадавікі сельскай гаспадаркі Беларусі, Героі Сацыялістычнай Працы паказваюць узоры ўмелай арганізацыі працы, шырока прымяняюць дасягненні перадавой аграбіялагічнай навукі і на гэтай аснове дабіваюцца павышэння ўраджайнасці, росту пагалоўя і прадуктыўнасці жывёлы.

Рэкамендацыйны спіс «Перадавы вопыт у сельскай гаспадарцы» ставіць сваёй мэтай пазнаёміць шырокія кругі работнікаў сельскай гаспадаркі з вопытам і дасягненнямі перадаві-

25 R 4 2009

коў соцыялістычнай сельскай гаспадаркі нашай рэспублікі. Ім могуць карыстацца бібліятэкары пры рэкамендацыі кніг, а таксама і самі чытачы, якія работаюць у той альбо іншай галіне сельскай гаспадаркі. Аўтары многіх рэкамендаваных у спісе кніг — гэта самі перадавікі сельскай гаспадаркі, Героі Соцыялістычнай Працы, выдатныя людзі нашай рэспублікі. У спіс уключаны кнігі, выданыя ў 1948—1952 г. г.

## КІРУЮЧЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

**Сталін І. В.** Прамова на Першым Усесаюзным з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў 19 лютага 1933 г. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1950. 20 стар.

У сваёй прамове І. В. Сталін даў баявую праграму па ўмацаванню калгаснага ладу, паставіў бліжэйшай мэтай калгаснага руху зрабіць ўсіх калгаснікаў заможнымі і калгасы — бальшэвіцкімі.

І. В. Сталін, растлумачыўшы сутнасць калгаснага шляху развіцця сельскай гаспадаркі і яго перавагі перад капіталістычным шляхам, указаў, што калгасы вызвалілі мільёны беднякоў ад кулацкай кабалы і паднялі іх да ўзроўня серадniakоў. І. В. Сталін указвае, што для ўмацавання калгасаў патрабуецца толькі сумленна працаваць, берагчы калгаснае дабро.

І. В. Сталін адзначыў велізарную ролю жанчын і моладзі ў калгасным будаўніцтве.

**Сталин И. В.** Речь на приеме колхозниц-ударниц свекловичных полей с руководителями партии и правительства 10 ноября 1935 г. В кн.: Ленин и Сталин о труде. Изд. 2, допол. М. Профиздат. 1941, стр. 582—583.

Прамова І. В. Сталіна прысвечана совецкім сялянам, якіх высока падняў калгасны лад, упершыню ў гісторыі стварыўшы ўмовы для магутнага росквіта ўсіх іх здольнасцей і талентаў.

У прамове І. В. Сталіна паказана, як непахожа становішча жанчын-калгасніц на становішча сялянкі ў мінулы час. І. В. Сталін указвае, што калгасніцы гэта зусім новыя людзі. Толькі свабодная праца магла выхаваць такіх гераінь працы ў вёсцы.

**Сталін І. В.** Прамова на нарадзе перадавых камбайнёраў і камбайнёрак з членамі ЦК ВКП(б) і Урада 1 ліпеня 1935 г. Мінск, Дзяржвыд БССР. 1952, стар. 3—11.

І. В. Сталін характарызуе шлях, які прайшла наша краіна за гады совецкай ўлады, паказвае глыбокія змяненні ў становішчы людзей, у эканоміцы краіны, у эканоміцы сялянскай гаспадаркі.

І. В. Сталін паставіў перад калгаснікамі задачу — дабіцца вырабу 7—8 мільярдаў пудоў зярна ў год і растлумачыў значэнне камбайнавай уборкі хлеба і працы камбайнёраў для паспяховага вырашэння гэтай задачы.

**Сталин И. В.** Экономические проблемы социализма в СССР. «Правда», 1952, 4 октября.

**Маленков Г. М.** Отчетный доклад Центрального Комитета ВКП(б) XIX с'езду партии. «Правда», 1952, 6 октября.

**Сабуров М. З.** Директивы XIX с'езда партии по пятому пятилетнему плану развития СССР на 1951—1955 годы. «Правда», 1952, 10 октября.

**Директивы** XIX с'езда партии по пятому пятилетнему плану развития СССР на 1951—1955 годы. Резолюция XIX с'езда по докладу Председателя Госплана тов. М. З. Сабурова. «Правда», 1952, 12 октября.

**Патоличев Н. С.** Отчетный доклад Центрального Комитета Коммунистической партии (большевиков) Белоруссии на XX с'езде КП(б)Б. Минск, Госиздат БССР, 1952. 96 стр.

**Аб мерах** уздыму сельскай гаспадаркі ў пасляваенны перыяд. Пастанова Пленума ЦК ВКП(б), прынятая па дакладу тав. Андрэева. Мінск, Дзяржвыд БССР. 1947, 64 стар.

**Указ** Президиума Верховного Совета СССР о повышении показателей для присвоения звания Героя Социалистического Труда и награждения орденами и медалями СССР колхозников, работников МТС и совхозов за получение высоких урожаев зерновых культур в целом, пшеницы, ржи, гречихи, проса, кукурузы, риса, сахарной свеклы, льна-долгунца, конопли, джута, кенафа, канатника, табака, махорки, подсолнечника, льна-кудряша, горчицы, клещевины, сои, арахиса, кориандра, семян многолетних и однолетних трав, картофеля и за достижение высоких показателей на уборке зерновых и масличных культур в 1952—1953 годах. М., «Известия», 1952. 46 стр.

**Рэзалюцыя** XIX з'езда Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі па справаздачы ЦК КП(б) Беларусі. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1949, стар. 15—24.

**Патоличев Н. С.** О мерах обеспечения высокой урожайности сельскохозяйственных культур и роста продуктивности животноводства в колхозах и совхозах Белорусской ССР в 1952 году. Сокращенная стенограмма доклада на VIII пленуме ЦК КП(б)Б 24 января 1952 года. Минск, 1952. 52 стр. (Материалы для докладчиков).

У сваёй прамове Н. С. Патолічаў падвёў вынікі работы партыйных арганізацый, савецкіх і сельскагаспадарчых органаў у галіне сельскай гаспадаркі за 1951 год.

Н. С. Патолічаў падрабязна гаворыць аб чарговых задачах, якія стаяць перад сельскай гаспадаркай рэспублікі па павышэнню ўраджайнасці ўсіх сельскагаспадар-

чых культур і ўздыму грамадскай прадуктыўнай жывёлагадоўлі ў 1952 годзе.

Н. С. Патолічаў вызначыў меры і сродкі ўмацавання партыйнага кіраўніцтва ўсімі галінамі калгаснай вытворчасці. У прамове асаблівая ўвага ўдзелена пытанням паспяховага правядзення веснавой сяўбы, апрацоўкі глебы, угнаення, асушэнню і асваенню балот і рабоце МТС.

## ПЕРАДАВЫЯ КАЛГАСЫ І СОЎГАСЫ

**Крупень І.** Калгас «Шлях Леніна» Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Мінск, Дзяржвыд БССР. 1951. 30 стар. (Вопыт работы перадавікоў сельскай гаспадаркі).

Калгас «Шлях Леніна» за кароткі час вышаў з ліку адстаючых ў раёне і дабіўся буйных поспехаў ва ўсіх галінах сваёй гаспадаркі.

У брашуры расказваецца, як у выніку ўпартай працы, скарыстоўваючы перадавыя прыёмы агратэхнікі, калгаснікі дабіліся высокай прадукцыйнасці працы і забяспечылі палепшанне матэрыяльнага і культурнага добрабыту ў сваім калгасе.

**Чыкун П. І.** Калгас імені Кірава. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1951. 40 стар. (Вопыт работы перадавікоў сельскай гаспадаркі).

У брашуры расказваецца аб росце грамадскай гаспадаркі калгаса імені Кірава, Веткаўскага раёна, аб калгасніках, якія сваёй самаадданай працай дасягнулі выдатных поспехаў ва ўсіх галінах сельскай гаспадаркі: раслінаводстве, жывёлагадоўле, садоўніцтве і гароднікцтве. Паказаны лепшыя людзі калгаса. У 1950 годзе калгас імені Кірава стаў адным з перадавых калгасаў Гомельскай вобласці.

**Трапашка І. Н.** Вопыт калгаса імені Жданава ў атрыманні высокіх ураджаяў зерневых культур і бульбы. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1951. 38 стар.

Калгас імені Жданава, Тураўскага раёна, Палескай вобласці з году ў год павышае ўраджай сельскагаспадарчых культур. Сярэдні ўраджай бульбы на ўсёй плошчы пасеву ў 155,9 га склаў у 1950 годзе па 189,9 цэнтнера з гектара, а з плошчы ў 23 га — па 234,6 цэнтнера з гектара. У брашуры дадзена кароткая характарыстыка калгаса, апісана агратэхніка зерневых і бульбы ў калгасе і ўказаны рэзервы далейшага росту ўраджайнасці палявых культур.

**Сяргейчык П. Н.** Вырошчванне ільну-даўгунцу ў калгасах Баранавіцкай вобласці. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1951. 40 стар. (Вопыт работы перадавікоў сельскай гаспадаркі).

Аўтар расказвае аб вопыце работы перадавых звенняў калгаса Баранавіцкай вобласці па вырошчванню высокіх ураджаяў ільну-даўгунцу. Апісаны глебава-кліматычныя ўмовы, неабходныя для росту ільну-даўгунцу, указваюцца мерапрыемствы па апрацоўцы глебы, месца ільну-даўгунцу ў севазвароце, прымяненне ўгнаенняў, спосабы падрыхтоўкі насення да пасеву, нормы і тэрміны сяўбы.

* * *

**Лебяздевіч Н. Ф. і Арцюхоў А. М.** Соўгас імя 10-годдзя БССР. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1952. 128 стар. (Вопыт работы перадавікоў сельскай гаспадаркі).

Брашура адлюстроўвае дзейнасць соўгаса, яго дасягненні і метады работы. Паказана, як соўгас змагаецца за далейшы ўздым і павышэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і рост пагалоўя жывёлы.

Аўтар паказвае, як у барацьбе за ўмацаванне калгаса выраслі выдатныя кадры соцыялістычнай гаспадаркі.

У 1948 годзе за поспехі ў атрыманні высокіх ураджаяў жыта брыгадзірам Калыску Паўлу Лаўрэнцьевічу, Саўчуку Фёдару Аляксеевічу і звеннявым Пайграй Ульяне Іванаўне і Стыкут Анастасіі Ігнацьеўне прысвоена званне Героя Соцыялістычнай Працы.

**Нагорская Е. Д.** Соўгас «Зарэчча» ў барацьбе за высокапрадуктыўную свінагадоўлю. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1952. 64 стар. (Вопыт перадавікоў сельскай гаспадаркі).

Брашура адкрываецца апісаннем шляхоў вырашэння кармавой базы, будаўніцтва і механізацыі жывёлагадоўчых памяшканняў, становішча малочна-таварнай фермы соўгаса. Найбольшае месца адводзіцца рабоце на свінагадоўчай ферме, тэхніцы кармлення і адкорма свіней. Вялікая ўвага адводзіцца міжпароднаму скрыжаванню

У канцы брашуры апісан вопыт арганізацыі агразоатэхнічнай вучобы і перадача вопыта работы жывёлагадоўчай фермы другім калгасам і соўгасам рэспублікі. Кніга ілюстравана малюнкамі і табліцамі.

**Кухарава Е. А.** 32 центнера озимой ржи с гектара. М., Сельхозгиз. 1948. 24 стр. (Производственный опыт Героев Социалистического Труда).

Аўтар брашуры — Еўдакія Арцёмаўна Кухарава — Герой Соцыялістычнай Працы; звеннявая калгаса імені Сталіна Васілевіцкага раёна Палескай вобласці.

Яе звяно ў 1947 годзе на асушаным тарфяніку плошчай ў 8,5 гектара атрымала па 32 цэнтнера азімага жыта з гектара.

У брашуры Е. А. Кухарава расказвае аб тых агратэхнічных прыёмах, якія прывялі яе звяно да выдатных поспехаў.

У пачатку брашуры апісана, як у калгасе праваздзілася асушэнне і расчыстка балот пад сельскагаспадарчыя культуры.

**Вішнеўскі М.** Герой Сацыялістычнай Працы Еўдакія Кухарава. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1948. 24 стар. (Герой Сацыялістычнай Працы).

Аўтар брашуры расказвае, як пад кіраўніцтвам партыйнай і камсамольскай арганізацыі аднаўляецца гаспадарка калгаса імені Сталіна, Васілевіцкага раёна Палескай вобласці, як уключыўшыся ў сацыялістычнае спаборніцтва, Еўдакія Кухарава са сваім звяном дабілася высокага ўраджаю азімага жыта на асушаным тарфяніку — 32 цэнтнеры з гектара, з плошчы ў 8,5 гектара.

**Шкурко Т. И.** 30 центнеров озимой ржи с гектара. М., Сельхозгиз, 1948. 40 стр. (Производственный опыт комсомольцев Героев Социалистического Труда).

Брашура напісана Героем Сацыялістычнай Працы Тамарай Шкурко, звеннявой камсамольска-маладзёжнага звяна калгаса «Чырвоная ніва», Брагінскага раёна, Палескай вобласці. Яна расказвае аб тым, як яе звяно дасягнула высокіх паказчыкаў у рабоце, вырасціла ў 1947 годзе высокі ўраджай азімага жыта. Апісаны ўсе агратэхнічныя прыёмы, якія прымяняліся ў яе звяне, паказана штодзённая дапамога, якую аказвалі звяну партыйныя і камсамольскія арганізацыі і праўленне калгаса.

**Пыжкоў В. І. і Новікаў І.** Герой Сацыялістычнай Працы Тамара Шкурко. (Нарыс). Мінск, Дзяржвыд БССР, 1948. 32 стар. (Героі Сацыялістычнай Працы).

Нарыс прысвечан камсамолцы Тамары Шкурко, звеннявой калгаса «Чырвоная ніва», Брагінскага раёна, Палескай вобласці. У брашуры расказана, што дзякуючы самаадданай працы і прымяненню перадавой агратэхнікі звяно т. Шкурко сабрала высокі ўраджай азімага жыта, у 1947 годзе — 30 цэнтнераў з гектара, плошчай у 8 гектараў.

**Савчик Ф. А.** Как мы получили 42 центнера озимой ржи с гектара на торфяных почвах. Стенограмма публичной лекции... Минск, Изд-во Акад. наук БССР. 1950. 16 стр. (О-во по распространению полит. и науч. знаний Белорус. ССР).

Герой Сацыялістычнай Працы Фёдар Аляксеевіч Саўчык, брыгадзір соўгаса «10-годдзе БССР», дзеліцца сваім вопытам вырошчвання высокага ўраджаю азімага жыта на тарфяных глебах. У сваёй лекцыі ён расказвае аб усім комплексе агратэхнічных мерапрыемстваў, якія

прымяняліся ў яго брыгадзе. У лекцыі асабліва падкрэсліваецца значэнне сувязі практыкі з мічурынскай навукай.

**Гузюк А. І.** Як мы атрымалі высокі ўраджай жыта. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1950. 24 стар.

Аляксандра Іосіфаўна Гузюк, ордэнаносец, звеннявая калгаса «Перамога», Кобрынскага раёна, Брэсцкай вобласці, расказвае аб вопыце сваёй работы і работы ўсёй брыгады, аб тым, як яны дружнай, самаадданай працай забяспечылі атрыманне высокага ўраджаю жыта.

У 1949 годзе паляводчая брыгада атрымала на 12 гектарах па 23,2 цэнтнера жыта з гектара, за што калгасніца А. І. Гузюк узнагароджана ордэнам Леніна, а 8 калгаснікаў медалямі «За трудовую доблесть» і «За трудовое отличие».

**Красніцкая М. П.** 29,2 цэнтнера азімага жыта з гектара. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1949. 24 стар. (Вытворчы вопыт перадавікоў сацыялістычнай сельскай гаспадаркі).

Звеннявая калгаса «Авангард», Гомельскага раёна, Марыя Пятроўна Красніцкая расказвае, аб тым, як яна са сваім звяном у 1948 годзе дабілася высокага ўраджаю азімага жыта на супясчаных глебах.

Аўтар падкрэслівае, што яе звяно атрымала высокі ўраджай, дзякуючы прымяненню правільнай агратэхнікі.

* * *

**Гецман А. Ф.** За тонну льноволокна с гектара. Стенограмма лекции... Минск, Изд-во Акад. наук БССР. 1951. 20 стр. (О-во по распространению полит. и науч. знаний Белорус. ССР).

Герой Сацыялістычнай Працы Анісся Фамінічна Гецман, звеннявая калгаса імені Варашылава, Стаўбцоўскага раёна, Баранавіцкай вобласці, дзеліцца сваім вопытам па вырашчванню высокага ўраджаю ільну.

Расказана, як А. Ф. Гецман і яе звяно, прымяняючы перадавую агратэхніку і самаадданна працуючы на полі, атрымалі ў 1949 годзе 7,6 цэнтнераў насення ільну і 9,3 цэнтнераў ільнавалакна з гектара.

**Лытысаў М. В.** Наш вопыт атрымання высокіх ураджаяў ільну. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1950. 48 стар.

Герой Сацыялістычнай Працы, старшыня калгаса імені Молатава, Глыбоцкага раёна, Полацкай вобласці, Лытысаў Міхаіл Васільевіч расказвае аб вопыце работы свайго калгаса па вырошчванню высокіх ураджаяў валакна і насення ільну-даўгунцу на вялікіх плошчах.

Аўтар пераканаўча даказвае, што толькі прымяненне ўсяго комплекса агратэхнічных мерапрыемстваў можа даць багаты ўраджай гэтай каштоўнай культуры.

У калгасе імені Молатава ў 1949 годзе сабралі з 11 гектараў па 6,4 цэнтнера валакна ільну-даўгунцу і 7 цэнтнераў насення ільну з гектара, за што М. В. Лытысаў удастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы.

**Савіцкі А. А.** Раіса Нікіфараўна Пятроўская. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1949. 32 стар. (Вытворчы вопыт Герояў Сацыялістычнай Працы).

У брашуры апісан вопыт работы звеннявой калгаса «Чырвоны партызан», Ветрынскага раёна, Полацкай вобласці. Расказана, як знатная ільнаводка, прымяняючы перадавую агратэхніку, сабрала рэкордны ўраджай — 34 пуды семян і каля 60 пудоў валакна з гектара.

**Рубан В. И.** За высокие и устойчивые урожаи льна-долгунца. (Из опыта передовиков льноводства Барановичской области). Минск, Госиздат БССР, 1952. 14 стр.

Перадавікі ільнаводства Беларусі, прымяняючы перадавыя прыёмы агратэхнікі дабіліся значных поспехаў.

У брашуры асвятляецца вопыт перадавых ільнаводаў Баранавіцкай вобласці П. Л. Колола, звеннявой калгаса імені Леніна, Любчанскага раёна, Героя Сацыялістычнай Працы; А. Ф. Гецман, звеннявой калгаса імені Варашылава, Стаўбцоўскага раёна, Героя Сацыялістычнай Працы; звеннявых калгаса імені Варашылава, Любчанскага раёна В. І. Комар і О. Ф. Красоўскай, удастоеных на абласной сельскагаспадарчай выстаўцы дыплома першай ступені. Дзякуючы паспяховаму развіццю ільнаводства калгас імені Варашылава стаў мііянерам.

## ВОПЫТ ПЕРАДАВІКОЎ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

**Панкевич А.** Опыт раздоя коров дояркой А. А. Павлович в совхозе «Россь», Гродненской области. Минск, Госиздат БССР, 1952. 10 стр. (М-во сельского хозяйства БССР. Упр. с.-х. пропаганды).

Брашура знаёміць з вопытам работы лепшай даяркі соўгаса «Россь» А. А. Паўловіч.

У 1951 годзе яна атрымала ў сярэднім па 6.209 кг. малака ад каровы і заняла першае месца сярод даярак Беларусі.

Аўтар паказвае, што высокіх паказчыкаў удою малака А. А. Паўловіч дабілася, дзякуючы правільнаму прымяненню комплекса заатэхнічных мерапрыемстваў.

**Шчэрбіч Е. І.** Як мы дасягнулі ўдою 5000 кілаграмаў малака на карову за год. Стэнаграма публічнай лекцыі... Мінск, Выд-ва Акад. навук БССР, 1950. 16 стар. (Т-ва па распаўсюджванню паліт. і навук. ведаў Беларус. ССР).

Аўтар Ева Іванаўна Шчэрбіч, даярка калгаса «Рассвет», Кіраўскага раёна, Бабруйскай вобласці паказвае, што поспехі па раздою кароў з'яўляюцца вынікам правільнага кармлення, добрага догляду і ўтрымання кароў і правільнай арганізацыі працы.

За дасягненне высокіх паказчыкаў у жывёлагадоўлі ў 1949 годзе Ева Іванаўна Шчэрбіч узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Гайко А.** Па 5200 кг. малака ад каровы за год. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1951. 36 стар. (Вопыт работы перадавікоў сельскай гаспадаркі).

У кнізе асвятляецца вопыт работы перадавой даяркі калгаса «Рассвет», Кіраўскага раёна, Бабруйскай вобласці, ордэнаносца Евы Іванаўны Шчэрбіч, якая дасягнула высокіх паказчыкаў у жывёлагадоўлі.

Аўтар падкрэслівае, што сацыялістычныя адносіны да працы, глыбокае веданне тэхнікі кармлення і ўтрымання жывёлы давалі Еве Шчэрбіч магчымасць павышэння малочнай прадуктыўнасці кароў.

У брашуры таксама паказана, што правільная арганізацыя і аплата працы садзейнічае павышэнню прадукцыйнасці працы.

**Матэвушаў В. І.** Даярка Еўгенія Дарашкова. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1950. 20 стар. (Вопыт работы перадавікоў сельскай гаспадаркі).

Брашура знаёміць з вопытам даяркі калгаса ордэна Леніна імені Валадарскага, Магілёўскага раёна Е. Дарашковай, якая атрымала да 4000 літраў малака ад каровы за год.

* * *

**Кобель А. І.** Наш вопыт вырошчвання жарабят. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1951. 32 стар. (Вопыт работы перадавікоў сельскай гаспадаркі).

Аўтар — загадчык конегадоўчай фермы калгаса імені Дзяржынскага, Грэскага раёна, Бабруйскай вобласці, Адам Іосіфавіч Кобель — перадае свой шматгадовы вопыт па вырошчванню жарабят. А. І. Кобель расказвае аб комплексе мерапрыемстваў, якія забяспечылі за апошнія гады вырошчванне ад 80 да 100% жарабят.

**Матэвушаў В. І.** Сяргей Ільіч Слабадзян. Мінск, Дзяржвыд БССР, 1949. 24 стар. (Вытворчы вопыт Герояў Сацыялістычнай Працы).

Нарыс аб Герое Сацыялістычнай Працы — старшым конюху калгаса «Шлях соцыялізма», Магілёўскага раёна, які вырасціў 26 жарабят ад 26 кабыл.

* * *

**Палескі П. К.** Племянная свінагадоўчая ферма калгаса «Чырвоны ўдарнік». Мінск, Дзяржвыд БССР, 1952. 48 стар.

У данай брашуры апісваецца перадавы вопыт свінаводаў калгаса «Чырвоны ўдарнік», Слуцкага раёна, Бабруйскай вобласці, якія з года ў год атрымліваюць высокія вытворчыя паказчыкі па свінагадоўлі. Апісаны метады і прыёмы па догляду, кармленню і ўтрыманню свіней і вырошчванню парасят.

**Жук М. И.** Опыт по выращиванию многоплодных пометов поросят. Минск, Госиздат БССР, 1952. 10 стр. (М-во сельского хозяйства БССР. Упр. с.-х. пропаганды).

У невялікай па аб'ёму брашуры 65-гадовая свінарка калгаса імені Сталіна, Смаргоньскага раёна, Маладзечненскай вобласці, Магдаліна Іванаўна Жук перадае каштоўны вопыт сваёй работы па вырошчванню многаплодных памётаў парасят. Нараду з добрым доглядам і правільным кармленнем свінаматак, кныроў і парасят аўтар прыдае вялікае значэнне і абыходжанню з імі. Жывёла ў адказ на клопаты і ласку адказвае павышанай прадуктыўнасцю.

1964 к

# ЗМЕСТ


| | Стар. |
|---|---|
| Кіруючыя матэрыялы . . . . . . | 5 |
| Перадавыя калгасы і соўгасы . . . . . | 7 |
| Вопыт перадавікоў жывёлагадоўлі . . . . | 11 |



Склалі: Н. В. КАЛЯДА
А. М. ДУКОР

Рэдактар: Р. М. Казуноў



ОИ 43055 Заказ 1575 Тираж 3000

Минск, типогр. Профиздата ВЦСПС

БЯСПЛАТНА